## Новая раўнавага для Еўропы

***„Мы не вінаватыя, але нягледзячы на гэта, мы нясём адказнасць," – пісаў калісьці Герман Гесэ. Сёння мы супрацьстаім найбольшаму крызісу сістэмы аховы здароўя, сацыяльнаму і эканамічнаму крызісам апошніх дзесяцігоддзяў. І хоць надыходу пандэміі ніхто не прадугледзеў і не пазбегнуў, у значнай ступені ад нас залежаць яе доўгатэрміновыя наступствы.***

Эканамісты сцвярджаюць, што Кітай чакае найбольшае эканамічнае запаволенне за апошнія дзесяцігоддзі, а ў Злучаных Штатах Амерыкі беспрацоўе можа дасягнуць нават 20%. Найбуйнейшыя эканомікі свету маюць намер вызначыць у рамках сваіх фіскальных пакетаў 4,8 трлн долараў ЗША на барацьбу з наступствамі COVID-19. Гэта амаль у тры разы больш за тыя сумы, якія былі выкарыстаны ў перыяд крызісу 2007–2009.

Таму сёння нам як ніколі патрэбна Еўропа Салідарнасці – з амбіцыйным бюджэтам і новай, адбудаванай раўнавагай. Функцыянаванне ЕС павінна засноўвацца на імкненні да салідарнага супрацоўніцтва, распачатага з мэтай абароны адзінага еўрапейскага рынка.

Мы павінны ўсведамляць, што рашэнні, якія мы прымаем цяпер, маюць экзістэнцыяльны характар. Мы павінны зрабіць усё, што ў нашых сілах, каб выратаваць еўрапейскія мары, планы і памкненні. Гэта вельмі няпростая задача, таму што яна патрабуе адначасовага прыняцця мер у многіх сферах. Эканоміка і здароўе патрабуюць зараз неадкладнага плана выратавання. Ужо сёння мы павінны акрэсліць найбольш важныя прынцыпы новай еўрапейскай раўнавагі.

### Асноўныя крытэрыі

Пандэмія каранавіруса жорстка ўсвядоміла нам крохкасць нашага сацыяльна-эканамічнага ладу. Яна паказала, як моцна Еўропа залежыць, напрыклад, ад ланцужкоў паставак з іншых кантынентаў. Для эканоміі і змяншэння выдаткаў вытворчасці многія еўрапейскія кампаніі перанеслі вытворчыя працэсы ў танныя азіяцкія рэгіёны, занядбаўшы айчынныя крыніцы забеспячэння. Сёння гэта здаецца каварным, але фінансавая дысцыпліна, якую рэалізавала Еўрапейская камісія, прымушала членаў ЕС рабіць складаны выбар, які часта прыводзіў да памяншэння дзяржаўных выдаткаў на ахову здароўя. Аднак гэта не прычына для таго, каб шкадаваць сябе, а для таго, каб узяць справу ў свае рукі.

Цяпер першым прынцыпам новай еўрапейскай раўнавагі павінна быць адбудова здольнасці супрацьстаяць наступствам такіх маштабных крызісаў. Еўропе патрэбны комплексны пакет эканамічнага аднаўлення для стымулявання еўрапейскай эканомікі. Неабходна наша сумесная згода па пытанні амбіцыйнай формы Шматгадовага фінансавага плана і павелічэння ўласных сродкаў, даходаў ЕС. Толькі такім чынам мы можам вярнуць раўнавагу, якая парушылася ў выніку ўнутраных праблем і ўзаемных антыпатый.

Мы цэнім, што ЕС спрашчае для сваіх членаў умовы супрацьдзеяння крызісу – стварыў інструменты, якія даюць гарантыі для пазык і больш гібкія прынцыпы карыстання еўрапейскімі сродкамі. Спрасцілася права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі ў краінах-

членах ЕС, а таксама часова спынена дзеянне палажэнняў Пакта стабільнасці і росту. Кожная дзяржава ЕС, адны хутчэй, другія пазней, у рамках сваіх бюджэтаў распачалі аперацыю па выратаванні рабочых месц і эканомікі. Аднак для таго, каб Еўропа вярнула сабе рост і бляск, мы сумесна павінны зрабіць больш.

**Бюджэт, які адпавядае часу**

Мы павінны пазбавіцца ад боязі перад амбіцыйным бюджэтам. У перыяд гэтага крызісу найбольш эфектыўнай формай саюзнай дапамогі стануць сродкі, вызначаныя на палітыку адзінства і сельскагаспадарчую палітыку. Аднак перанос сродкаў у рамках ужо выдзеленых сродкаў з'яўляецца ўсяго толькі элементам кароткатэрміновай тактыкі выжывання. А Еўропе патрэбна стратэгія адбудовы сваіх пазіцый.

ЕС павінен вызначыць цалкам новыя фінансавыя сродкі (магчыма, у рамках фонда „Recovery”) на супрацьдзеянне эканамічным наступствам пандэміі. Мы ведаем з мінулага, што стратэгія austerity – зацягвання паясоў у перыяд крызісаў 2007–2013 гадоў – не спраўдзілася.

Мы яшчэ ў камфортнай сітуацыі, таму што можам вызначыць новыя крыніцы фінансавання. Увядзенне падатку на фінансавыя аперацыі, лічбавага падатку, падатку на вугляродны след імпарту з трэціх краін альбо Single Market Fee стала бы важнай крыніцай уласных даходоў ЕС.

Яшчэ адной, па-ранейшаму нявырашанай мерай з'яўляецца абмежаванне падатковых махлярстваў. Краіны-члены ЕС страчваюць кожны год мінімум 200 млрд еўра праз трансгранічныя злоўжыванні падатковых сістэм (VAT, CIT, шэрая зона). Гэта больш за гадавы бюджэт ЕС. ЕС павінен зліквідаваць падатковы рай. Гэта вялікі рэзерв, і ён паказвае фінансавы патэнцыял Еўропы. Тут і зараз мы павінны выпрацаваць сродкі на новыя вялікія інвестыцыі ў інавацыі, інфраструктуру і адбудову многіх звёнаў ланцужка вытворчасці ў Еўропе.

Старшыня Еўрапейская камісіі нядаўна сказала, што „на працягу апошніх чатырох тыдняў Еўропа зрабіла больш, чым ў першыя чатыры гады апошняга крызісу ”. Гэта праўда. Сёння супольнасць супрацьстаіць беспрэцэндэнтным выклікам. Але гэта ўсё роўна толькі першы кіламетр марафону, які нас чакае. Тое, як мы справімся з наступствамі пандэміі, па-новаму акрэсліць Еўрапейскі саюз. „Будучыня пачынаецца сёння, а не заўтра”, – гаварыў святы Ян Павел II. Час для нашых дзеянняў менавіта зараз.